## НЯДЗВЕЦКІ ЮСІФ МАРКАВІЧ – 105

Нарадзіўся ў г. Магілёве ў 1908 г. У 1927–1930 гг. працаваў машыністам паравой кацельні на кандытарскай фабрыцы «10 гадоў Кастрычніка» у Магілёве. Пасля службы ў Чырвонай Арміі працаваў на заводзе «Анега» (Петразаводск). У 1935 г. па вярбоўцы паехаў у Ленінград, дзе паступіў на працу машыністам на ледакол «Ермак». Хадзіў на Таймыр, па ўзбярэжжу мора Лапцевых.

У цяжкую навігацыю ўвосень 1937 г. у Арктыцы было зацёрта ільдамі некалькі суднаў, у т.л. ледаколы «Садко», «Малыгін» і «Георгій Сядоў». У канцы жніўня 1938 г. да іх прыбіўся ледакол «Ермак» і вывеў з дрэйфу судны «Садко» і «Малыгін». Вывесці «Георгія Сядова» не атрымалася з прычыны пашкоджання рулявога кіравання. Ён быў пакінуты дрэйфаваць з камандай добраахвотнікаў з 15 чалавек, сярод якіх быў і машыніст І. Нядзвецкі.

Падчас дрэйфу каманда вяла назіранні за рухам ільдоў, астранамічныя, акіяналагічныя, метэаралагічныя назіранні, праводзіла магнітныя і гравітацыйныя вымярэнні. Дрэйф працягваўся 812 сутак і скончыўся 13 студзеня 1940 г. у Грэнландскім моры. Шлях «Георгія Сядова» склаў 6100 км. Усім 15 членам вандроўкі, у т.л. і І. Нядзвецкаму, было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Затым была вучоба ў Маскоўскай прамысловай акадэміі, удзел у Вялікай Айчыннай вайне на Паўночным флоце і 1-м Беларускім фронце.

З 1946 г. І. Нядзвецкі працуе начальнікам палярнай станцыі на мысе Арктычны, іншых станцыях. Трагічна загінуў у апошні дзень 1959 г. на пажары пры ратаванні дакументаў у адным з будынкаў палярнай станцыі. Пахаваны ў Маскве.

*У.Г. Хамякоў*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова